ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (1223)

ЧАЦВЕР 7 снежня 1978

Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЧЫТАЕМ, АБМЯРКОЎВАЕМ КНІГУ ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА «ЦАЛІНА» ● УМАЦАВАННЕ САДРУЖНАСЦІ БДУ З ВЫШЭЙШЫМІ НАВУЧАЛЬНЫМІ УСТАНОВАМІ БРАЦКІХ КРАІН ● ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ АДДЗЯЛЕННІ УНІВЕРСІТЭТА ● БДУ РЫХТУЕЦЦА ДА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА СССР ● ВЫНІКІ РАБОТЫ СНТ ФАКУЛЬТЭТАЎ ● ЯК ПРАЦУЕ ГРУПА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ ФАКУЛЬТЭТА РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ ● ВЕЧАР САВЕЦКА-В'ЕТНАМСКАЙ ДРУЖБЫ ● ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ.



У гэтыя дні студэнты БДУ імя У. І. Леніна рыхтуюцца да семінараў па кнізе Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева «Цаліна», якая стала важнай з'явай у грамадска-палітычным і духоўным жыцці нашай краіны. У кнізе натхнёна паказана шырокая панарама легендарнай эпапеі. Гэты глыбока хвалюючы расказ, які стаў у адзін рад з «Малой зямлёй» і «Адраджэннем», складае разам з імі своеасаблівую энцыклапедыю народнага жыцця, у якой адлюстраваны памятныя этапы ў гісторыі нашай Айчыны.

Фота М. Дубовіка.

## ПА БДУ
### інфармацыя

## НА СПРАВАЗДАЧНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

**студэнцкага навуковага таварыства універсітэта падведзены вынікі работы СНТ факультэтаў за лістапад.**

Журы аднагалосна прысудзіла першае месца гістарычнаму факультэту (старшыня СНТ В. Пісараў). На другім — радыёфізікі (старшыня СНТ С. Протас). Трэцяе месца за навуковым таварыствам хімічнага факультэта (старшыня СНТ А. Півуноўская). Усе тры факультэты правялі найбольшую колькасць канферэнцый, выпусцілі шмат бюлетэняў і насценных газет, змястоўнымі былі ў іх таксама і справаздачы аб рабоце гурткоў.

СНТ юрыстаў, географаў і журналістаў не прынялі ніякага ўдзелу ў пасяджэнні, таму і «заваявалі» апошнія месцы.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## СУСТРЭЧЫ

**з выдатнымі пісьменнікамі і журналістамі, творчымі работнікамі радыё і тэлебачання на журфаку не рэдкасць.**

На гэты раз аўдыторыя будучых ідэалагічных байцоў прагна лавіла кожнае слова лаўрэата Ленінскай прэміі камсамола Беларусі, паэта Рыгора Барадуліна. Рыгор Івanaвіч пабудаваў сваю гутарку з адказаў на пытанні, якія цікавілі студэнтаў: пра беларускую літаратуру, пра творчасць сучасных паэтаў і пісьменнікаў, пра кнігі, якія хутка выйдуць у свет. Таксама адзначыў ён некаторыя недахопы і памылкі ў творчасці маладых, якія толькі што прыйшлі ў паэзію.

— У вершы павінна адчувацца эмацыянальнае пачуццё, ёмістасць слова, моцная мускулатура. Патрэбна не толькі, каб слова валодала паэтам, але каб паэт валодаў словам. Тое ж самае можна сказаць і пра журналістыку. Яна павінна быць «зубастай».

Р. І. Барадулін прачытаў свае новыя вершы, якія былі напісаны пад уплывам паездкі ў Фінляндыю, а таксама свае гумарыстычныя творы. На развітанне беларускі паэт пакінуў нам свае аўтографы.

**А. ЯКУБОЎСКАЯ.**

## КНІГА НІЛА ГІЛЕВІЧА

**з яго аўтографам застанецца мне на ўсё жыццё памяццю аб аўтарскім вечары паэта.**

Сюды, у актавую залу універсітэта, прыйшлі аматары паэзіі і перакладаў дацэнта кафедры беларускай літаратуры філфака, вядомага беларускага паэта і перакладчыка.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, вядомы беларускі празаік В. Быкаў выступіў са словам аб творчасці паэта, высока ацаніўшы мастацтва Ніла Сямёнавіча Гілевіча. А потым у цішыню залы ўліліся лірычныя вершы. Цёплымі апладысментамі сустракалі слухачы гумарыстычныя і сатырычныя творы.

Нілам Гілевічам зроблена нямала перакладаў з паэзіі брацкай Балгарыі, дзе ў яго многа блізкіх сяброў-паэтаў. Цікава было паслухаць і гэтыя пераклады.

Непрыкметна прайшоў час, і настала пара развітвацца з паэтам. Са словам падзякі выступіла студэнтка філфака Таня Ламека.

**А. ДАШЧЫНСКІ,**
**студэнт журфака.**

# На шляху ў краіну ведаў

**З пачаткам навучальнага года можна павіншаваць падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта, якое прыняло ў гэтым годзе 325 слухачоў. Наш карэспандэнт А. ГРУЗДЗІЛОВІЧ у адзін з гэтых першых дзён пабываў на занятках у групе будучых радыёфізікаў.**

Сёння на рабфак прыйшлі тыя, каго адразу пасля заканчэння школы прывабіў працоўны шлях, каго паклікалі камсамольскія будоўлі, заводы, фабрыкі, калгасныя палі.

Прайшоў час, і вось, узбагачаныя вопытам, акрэсліўшыя свае шляхі ў жыцці, юнакі і дзяўчаты пацягнуліся да ведаў. І калі звычайны абітурыент на пытанне, чаму ён вырашыў паступаць на абраны факультэт, адказвае часта заблытана і не вельмі канкрэтна, то адказ рабфакаўца звычайна не выклікае дадатковых пытанняў.

Сяргей Кунцоў:

— Універсітэт дае найбольш поўны аб'ём ведаў па прадмету, які мяне цікавіць, — радыёфізіцы. Займаюся ёю амаль «колькі сябе памятаю».

Аляксандр Макарэвіч закончыў радыётэхнічны тэхнікум, працаваў год на ВТА «Гарызонт», служыў у арміі сувязістам. І таму мае права на больш катэгарычны адказ:

— Буду павышаць кваліфікацыю радыёфізіка.

Рабфакаўцы — няхай яны не пакрыўдзяцца за такое параўнанне, — нягледзячы на сталы ўзрост, у першыя дні заняткаў вельмі нагадваюць школьнікаў. На перапынках юнакі і дзяўчаты яшчэ трымаюцца асобнымі групкамі, нібы прыглядаюцца адзін да аднаго.

А вось і званок. У тую ж хвіліну ў аўдыторыю вяртаюцца рабяты. Дысцыпліна! Які дэкан зараз не пазайздросціць загадчыку падрыхтоўчага аддзялення! У групах слухачоў яшчэ нават старасты не назначаны, але парадак трымаецца на самасвядомасці.

На папярэдняй лекцыі я звярнуўся да суседа справа і пачуў:

— Не перашкаджай слухаць.

А на перапынку Віталій Анішчанка звярнуўся да мяне сам.

— Што цябе цікавіць?

— Адкуль гэта самадысцыпліна?

— Праслужыў бы два гады камандзірам батарэйнай радыястанцыі — такіх пытанняў не задаваў бы. У арміі навучылі дысцыпліне.

Крыху залішне ажыўленая лекцыя па літаратуры выклікала спрэчку на наступным перапынку. Спрэчка ў гэтых абставінах — гэта размова зацікаўленых бакоў, пачатак знаёмства. Вось і атрымліваецца, што ў групы будучых радыёфізікаў ёсць ужо свая праблема. Аб ёй выказваюцца ўласныя меркаванні, ужо зараз вызначаюцца першыя сімпатыі і антыпатыі.

Наташа Шыліна лічыць, што весялосць патрэбна тады, калі зроблена справа. А лекцыя — таксама справа.

— А бывалыя студэнты гавораць: лекцыі няма для чаго слухаць, — устаўляе нехта.

— Не толькі трэба слухаць— канспектаваць абавязкова, — лічыць Ігар Крылоў.

— Жыццё пакажа, — канстатуе Аляксандр Барысаў, — як ужо паказала нам, што без навукі не абысціся. Таму мы і апынуліся тут, на рабфаку.

З гэтым усе згаджаюцца. І таму на змену рознагалоссям прыходзіць узаемаразуменне, усе адчуваюць сябе бліжэй адзін да аднаго. Быццам дваццаць кропак, раскіданых недзе ў прасторы, аб'яднала аднойакружнасцю.

Заняткі скончыліся.

— Рабяты, дзе тут сталовая? А дзе інтэрнат № 3? А дзе універсітэцкая бібліятэка? — гучаць пытанні ў калідоры і на лесвіцы. Рабфакаўцы знаёмяцца з універсітэтам...

## БДУ рыхтуецца да перапісу

Насельніцтва Савецкага Саюза ўжо зараз дасягнула больш 250 млн. чалавек. У вялізнай краіне, дзе кожную мінуту паяўляецца на свет 8 новых жыхароў, цяжка вызначыць пастаянную колькасць насельніцтва. Таму так неабходны рэгістрацыі і штогоднія перапісы яго па рэспубліках, краях, абласцях, а таксама ўсесаюзныя, якія праводзяцца кожныя 10 год.

Чарговы ўсесаюзны перапіс насельніцтва па пастанове Савета Міністраў СССР будзе праводзіцца на працягу 8 дзён: з 17 па 24 студзеня 1979 года. Падрыхтоўка да яго пачалася яшчэ з 1974 года, калі была распрацавана праграма перапісу і яе асноўныя палажэнні. Справа гэта патрабуе саліднай навуковай арганізацыйнай і тэхнічнай падрыхтоўкі. Таму гэта не толькі работа статыстычных упраўленняў, а ўсіх грамадзян краіны. Рыхтуецца да яе правядзення і Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна. Яшчэ ў ліпені гэтага года саветам універсітэта былі распрацаваны мерапрыемствы па

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Справы прафсаюзныя

# ШКОЛА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Выступаючы на XVIII з'ездзе камсамола, Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Камсамольскія сходы павінны стаць школай камуністычнага выхавання моладзі». Гэтыя словы ў поўнай меры можна аднесці і да сходаў прафсаюзных. На іх закранаюцца розныя бакі грамадскай дзейнасці юнакоў і дзяўчат, выкрываюцца недахопы і прымае агалоску перадавы вопыт.

Нядаўна з мэтай бліжэйшага знаёмства з работай прафсаюзных арганізацый факультэтаў прафком універсітэта арганізаваў конкурс на лепшае правядзенне справаздачна-выбарнай канферэнцыі.

Усе адзінаццаць канферэнцый прайшлі на факультэтах арганізавана. У ходзе іх работы студэнты выказалі шэраг крытычных заўваг і слушных прапаноў. Так, напрыклад, прафсаюзнае бюро факультэта журналістыкі мала ўдзяляла ўвагі вучобе першакурснікаў. У выніку ў іх самая нізкая на факультэце паспяховасць.

На фізічным факультэце існуюць дзве камісіі: вучэбна-вытворчая ад прафбюро і вучэбна-выхаваўчая ад камітэта камсамола. Як выявілася з выступленняў, яны выконвалі на працягу цэлага года адны і тыя ж функцыі.

Цікава, што планы работы камісій былі амаль аднолькавыя, а здзяйснялі яны іх паасобку. Вось і паўстала пытанне: чаму ж гэтыя камісіі не аб'яднаць у адну — баявую і больш дзейсную? Думаецца, што карысць факультэту была б большая.

Па-дзелавому, прынцыпова спрачаліся студэнты і над роляй прафгрупорга ў арганізацыі. На думку многіх, ён павінен, як і камсорг у калектыве, быць важаком.

Для ліквідавання недахопаў і ўкаранення ў жыццё паступіўшых прапаноў выбраны пры прафкоме універсітэта шматлікі актыў з прадстаўнікоў усіх прафсаюзных арганізацый факультэтаў. Ён прыступіў да работы.

**Л. ТУРБАЛ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).**

# УМАЦАВАННЕ САДРУЖНАСЦІ

Закончылася вытворчая практыка студэнтаў нашага універсітэта ў вышэйшых навучальных установах брацкіх сацыялістычных краін, якая была прадугледжана і запланавана праграмай супрацоўніцтва паміж Белдзяржуніверсітэтам імя У. І. Леніна і універсітэтамі ГДР, НРБ, СФРЮ і ПНР.

У Сафійскім універсітэце імя К. Ахрыдскага знаходзілася група студэнтаў-матэматыкаў. З вялікай цікавасцю яны азнаёміліся з арганізацыяй і работай адзінага цэнтра па навуцы і падрыхтоўцы кадраў у галіне матэматыкі і механікі, з тэматыкай навуковых даследаванняў, што праводзяцца ў сектарах адзінага цэнтра, асабліва з напрамкамі, якія развіваюцца і ў БДУ імя У. І. Леніна.

Дзве групы фізікаў практыкаваліся ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы — у Гальскім універсітэце імя М. Лютэра, а таксама ў Іенскім — імя Ф. Шылера. Навуковая праграма практыкі выконвалася на базе вучэбных і навукова-даследчых лабараторый секцыі фізікі, дзе студэнты дэталёва азнаёміліся з пастаноўкай вучэбнай і навукова-даследчай работы секцый, эксперыментальнымі ўстаноўкамі, пытаннямі тэорыі і навуковай літаратурай. У ходзе выканання навуковай праграмы практыкі студэнты-фізікі праслухалі цыкл лекцый па вялікай тэматыцы, правадзілі эксперыментальныя даследаванні, якія іх зацікавілі.

У Рэзендорфе група беларускіх фізікаў пабывала ў цэнтральным інстытуце ядзерных даследаванняў, дзе студэнты агледзелі атамны рэактар і азнаёміліся з працэсам вырабу ізатопаў для медыцыны і іншых галін народнай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што, акрамя выканання вучэбнай праграмы, студэнты універсітэта азнаёміліся з гісторыяй і культурай народаў гэтых краін, з развіццём культуры і мастацтва брацкіх краін у цяперашні час.

Паспяхова праходзіла і вытворчая практыка студэнтаў брацкіх сацыялістычных краін у нашым універсітэце. Тры групы балгарскіх студэнтаў (матэматыкі, радыёфізікі і географы) атрымалі шырокую магчымасць дэталёва азнаёміцца з асноўнымі навуковымі кірункамі работы розных кафедр і лабараторый. Асаблівую цікавасць у гасцей выклікала арганізацыя работы студэнтаў у вылічальным цэнтры. Група балгарскіх географаў наведала вучэбныя базы геаграфічнага факультэта, азнаёмілася з асноўнымі напрамкамі навуковых даследаванняў факультэта, тэматыкай курсавых і дыпломных работ студэнтаў.

Студэнты з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера за перыяд праходжання практыкі ў БДУ праявілі выключную дапытлівасць, зацікаўленасць і сур'ёзныя адносіны да сваёй справы.

Своеасаблівым працягам вытворчай практыкі з'явілася для гасцей з ГДР наведанне гістарычных і памятных мясцін, сустрэчы з цікавымі людзьмі, экскурсіі.

Што ж дае такі абмен групамі студэнтаў паміж БДУ імя У. І. Леніна і навучальнымі ўстановамі іншых сацыялістычных краін? Перш за ўсё, напэўна, тое, што ён дае магчымасць нашым і замежным студэнтам расшырыць і паглыбіць свае веды аб садружнасці сацыялістычных краін, аб рэвалюцыйных і баявых традыцыях, сучасным мастацтве і культурнай спадчыне нашых краін. Больш таго, ён садзейнічае ўмацаванню супрацоўніцтва паміж навучальнымі ўстановамі. З году ў год студэнты і выкладчыкі з яшчэ большай актыўнасцю ўключаюцца ў работу па сумесных даследаваннях.

**В. ТАБУЛІН.**

Рэпліка

# І ЯШЧЭ РАЗ ПРА ШЭФСТВА

У сярэдняй школе № 3 горада Мінска, куды мы былі прызначаны шэфамі, нас сустрэлі насцярожана і няветліва:

— Зноў шэфы? Колькі ж можна!

Нас, вядома, здзівіў такі прыём. Ішлі ў школу з самымі лепшымі намерамі, рыхтаваліся, каб было аб чым расказаць рабятам, а тут...

Але такая насцярожанасць кіраўнікоў школы мела свае падставы. Вось што расказаў нам настаўнік гісторыі Сямён Рыгоравіч Мельнік:

— Ваш факультэт за гэты навучальны год ужо трэці з ліку факультэтаў універсітэта, якія выказалі жаданне быць нашымі шэфамі.

Спачатку прыйшлі гісторыкі. Яны нам наабяцалі шмат цікавых спраў, але на гэтым і спыніліся.

Абмежаваліся адным наведваннем школы і студэнты філалагічнага факультэта. Мы ўсё яшчэ чакаем іх, хоць назначаны час даўно прайшоў.

А зараз вось даведаліся, што і вы яшчэ нашы шэфы. Трэці факультэт за гэтыя некалькі месяцаў! Здаецца б — добра! Але нічога добрага мы пакуль што не бачым...

Вось які невясёлы маналог давялося нам выслухаць.

Чаму ж так атрымалася, што кожны шэфскі сектар кожнага з факультэтаў сам сабе шукае падапечных? Здаецца мне, што шэфскаму сектару камітэта камсамола універсітэта трэба палепшыць каардынацыю шэфскай работы на факультэтах і з большай увагай адносіцца да персанальнай адказнасці за шэфства.

**Н. МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**



У Паўла Церашковіча, студэнта IV курса гістарычнага факультэта, за плячыма сем сесій. Пяць з іх ён здаў на выдатна.

На пытанне, у чым сакрэт яго поспеху, юнак адказаў проста:

— Пастаянная падрыхтоўка да практычных заняткаў — гэта значная частка поспеху на экзаменах.

Фота **А. Русаковіч.**

# БДУ рыхтуецца да перапісу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

падрыхтоўцы да ўсесаюзнага перапісу. Вызначылі яе ўдзельнікаў, абавязалі універсітэцкае таварыства «Веды» выступаць з лекцыямі і гутаркамі, прыцягнулі да гэтай работы прадстаўнікоў усіх факультэтаў.

16 выкладчыкаў і работнікаў тэхнічных служб будуць выконваць абавязкі загадчыкаў аддзелаў участкаў Кастрычніцкага раёна. 250 студэнтаў II—III курсаў філфака накіроўваюцца ў органы дзяржаўнай статыстыкі ў якасці лічыльшчыкаў. Яны вызваляліся ад сельгасработ, а іх экзаменацыйная сесія перанесена на снежань 1978 года. Усе, хто ўдзельнічае ў перапісе, вызвалены ад заняткаў, а тыя, хто працуе,— ад асноўнай работы.

Усе загадчыкі перапісных участкаў і іх намеснікі прайшлі спецыяльнае навучанне і нядаўна здалі экзамен. Яны азнаёміліся са схематычнымі планамі і картамі, парадкам запаўнення перапісных лістоў. На іх ускладаецца ўсё кіраванне работай па перапісу насельніцтва.

У цяперашнюю праграму ўключаецца 16 пытанняў. На 11 з іх адказы будуць атрыманы ад усяго насельніцтва і на 5 пытанняў — ад 25 працэнтаў пастаяннага насельніцтва пры выбарачным перапісе. Асноўнымі пытаннямі з'яўляюцца: адносіны да галавы сям'і, катэгорыя насельніцтва (пастаяннае або наяўнае), пол, узрост, знаходжанне ў шлюбе, нацыянальнасць, родная мова, адукацыя, навучанне, крыніца сродкаў існавання.

Ад узроўню падрыхтоўкі ўдзельнікаў перапісу, іх добрасумленнасці залежыць поспех перапісу. Таму ўжо ў пачатку снежня пачнуцца рэгулярныя групавыя заняткі са студэнтамі-лічыльшчыкамі. Яны у падрыхтоўчы перыяд выступяць перад насельніцтвам з дакладамі і лекцыямі, распаўсюдзяць брашуры аб перапісе. Перад яго пачаткам, вызначыўшы і вывучыўшы свае ўчасткі, лічыльшчыкі на працягу 5 дзён папярэдзяць жыхароў, выявяць найбольш спрыяльны для перапісу на даным участку час. А прыступяць да ўсесаюзнага перапісу паўсюдна ў 8 гадзін раніцы 17 студзеня і закончаць яго ўвечары 24 студзеня.

Студэнты растлумачаць кожнаму, што даны месяц і дзень выбраны ў сувязі з найменшай рухомасцю насельніцтва, абсалютная большасць якога знаходзіцца на месцы пастаяннага пражывання, а таксама для супастаўлення з папярэднімі перапісамі, якія праводзіліся ў студзені 1959 і 1970 гадоў. З 27 па 31 студзеня інструктары-кантралёры сумесна з лічыльшчыкамі правядуць паўторныя абходы. На гэтым заканчваецца асноўны этап перапісу. Далей звесткі паступяць у ЦСУ СССР і там будуць усебакова апрацаваны.

Перапіс павінен прайсці кожны жыхар краіны. Гэта добра засвоілі ўсе яго ўдзельнікі. Так, выкладчык кафедры беларускай літаратуры Р. М. Семашкевіч будзе працаваць намеснікам загадчыка аддзела. Ён ужо зараз азнаёміўся з ўсёй дакументацыяй і на днях прыступае да работы. Загадчыца кабінета методыкі матэматыкі І. С. Андрушчанка, выкладчык юрфака С. І. Алікевіч, дацэнт кафедры беларускай літаратуры К. Г. Хромчанка і іншыя прыступяць да правядзення заняткаў са студэнтамі. Кожны, хто ўдзельнічае, павінен ведаць аб вялікай адказнасці перапісных кадраў. Па краіне 750 тысяч чалавек будуць праводзіць перапіс, і калі кожны лічыльшчык прапусціць аднаго чалавека, то ў цэлым па Саюзу недаўлік складзе 600 тысяч жыхароў.

Кожны лічыльшчык, інструктар, загадчык аддзела атрымлівае пасведчанне ўдзельніка перапісу і жэтон-значок з надпісам: «Усесаюзны перапіс насельніцтва». З 11 студзеня па 5 лютага ім прадастаўляецца права бясплатнага праезду ва ўсіх відах гарадскога і прыгараднага транспарту.

Куратарамі груп факультэтаў праведзены гутаркі са студэнтамі аб значэнні і парадку правядзення перапісу, абавязках кожнага перапісваючага. Супрацоўнікамі універсітэта праслухан магнітафонны запіс гутаркі аб падрыхтоўцы і правядзенні ўсесаюзнага перапісу і яго кароткай гісторыі. На высокім узроўні праводзіцца растлумачальная работа аб яго палітычным і народнагаспадарчым значэнні. Кожны слухач ведае, што перапіс дае магчымасць вызначыць будучыя працоўныя рэсурсы грамадства, мець найбольш дакладныя звесткі аб колькасці працоўных, служачых і калгаснікаў у краіне, іх састаў па адукацыі і прафесіях.

Статыстыка перапісу пакажа глыбокія змены ў жыцці народа і гаспадаркі краіны, пераўтваральную сілу сацыялістычнай сістэмы і яе перавагу над капіталістычнымі краінамі.

**М. БАЖКО.**

Народны кантроль

# Як мы працуем

Нямногім больш двух год працуе група народнага кантролю факультэта радыёфізікі і электронікі. У саставе групы 10 чалавек.

У сваей рабоце група народнага кантролю факультэта асноўную ўвагу ўдзяляе праверцы вучэбнай, навуковай работы і матэрыяльна-бытавога забеспячэння. Гэтыя пытанні і вызначаюць структурны састаў групы народнага кантролю факультэта. Работу сектараў узначальваюць вопытныя выкладчыкі і супрацоўнікі. Так, сектар вучэбнай работы вядзе выкладчык кафедры ЭММ, дацэнт М. В. Мішурная, сектар навуковай работы — выкладчык кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ дацэнт І. Т. Краўчанка.

Работа групы вядзецца ў адпаведнасці з планам, складзеным з улікам заўваг і прапаноў грамадскіх арганізацый і супрацоўнікаў факультэта. Так, напрыклад, была праведзена выбарачная праверка вучэбных лабараторый, якая паказала, што кафедры праводзяць вялікую работу па стварэнню практыкумаў. Але вялікія цяжкасці ў рабоце складваюцца з-за таго, што лабараторыям не хапае памяшканняў, абсталявання, мэблі. Недастатковая колькасць лабарантаў і ратапрынтных выданняў таксама дрэнна адбіваецца на рабоце.

Вынікі праверак даводзяцца да ведама адпаведных арганізацый і службовых асоб. Затым група народнага кантролю правярае, як ліквідуюцца адзначаныя недахопы.

Інфармацыя аб тым, што зроблена па рэкамендацыях народных кантралёраў, план работы і састаў групы вывешваюцца на стэндзе групы народнага кантролю. Акрамя таго, на стэндзе ёсць скрынка для пісьмаў і паведамленняў супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта ў адрас групы.

**І. КОБАК,**
**старшыня ГНК**
**факультэта радыёфізікі**
**і электронікі.**



Трэцякурсніца фізічнага факультэта Людміла Калітуха выконвае лабараторную работу па радыёэлектроніцы.
Фота **М. Дубовіка.**

# АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЕ «НАСЦЕНКА»

**АГЛЯД ДРУКУ**

Запытайце студэнтаў, што чакаюць яны ўбачыць на старонках насценнай газеты, і яны адкажуць: адлюстраванне студэнцкіх будняў, абмеркаванне хвалюючых праблем. Вядомая рэч, такая задача паўстае перад кожнай факультэцкай рэдкалегіяй. Але адно ўсведамляць гэту задачу, а другое — ажыццяўляць яе.

З трох насценных газет — «Гісторык», «Хімік» і «Віта» (апошняя — орган дэканата, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыі біяфака), з якімі мне давялося пазнаёміцца, апошняя ў большай меры адгукаецца на запатрабаванні чытача.

Але вернемся да насценгазет гісторыкаў. Іх шмат. Рэдактар «Гісторыка» Мікалай Калядка растлумачыў не без гонару, што да Кастрычніцкага свята, акрамя факультэцкай газеты, выйшлі спецыяльныя нумары і на курсах.

Абавязкі рэдактара Мікалай выконвае трэці год, газетай у асноўным задаволен. «Вось толькі ў нас гумару малавата», —паскардзіўся ён.

Давайце прааналізуем некалькі нумароў газеты. Першае, што адразу кідаецца ў вочы, — неахайнасць. Расплыўчатыя загалоўкі, не падчышчаныя лініі ад алоўка, невыразныя, бляклыя здымкі. Складваецца ўражанне, што газета нараджаецца ў спешцы.

А зараз звернемся да матэрыялаў. З вялікай іх колькасці выдзяляецца гэты: «Камсамольскі сход: строгая праверка нашых сіл» (І. Велічанскі). Аўтар узнімае цікавыя праблемы, выказаныя на камсамольскім сходзе, уносіць слушныя прапановы.

Астатнія заметкі ў большасці сваёй нагадваюць адпіскі.

Не здолела таксама газета ўдала пачаставаць чытача сваёй факультэцкай разынкай — матэрыяламі пад рубрыкай «Аб малавядомым».

Не памыліўся рэдактар, калі скардзіўся на недахоп у газеце гумару. Гэта так. Шчыра кажучы, сумна і нецікава чытаць такую газету. Але вось рэдкалегіі некаторых курсавых газет гістфака «не без гумару» выпусцілі свае святочныя нумары. Адны з іх абмежаваліся плакатам, іншыя перапісалі з газет ці часопісаў звесткі аб гістарычным шляху нашай краіны (цікава, чаму пад гэтымі матэрыяламі стаяць подпісы студэнтаў?). Ёсць, праўда, спробы ўласнага асэнсавання цяперашняга і мінулага часу. Спробы, мякка кажучы, няўдалыя. Напрыклад: «Гэта з нашых рук не выбіць сёння молат на гіганцкіх будоўлях, гэта па нашаму жаданню нясуцца магутныя машыны, з-пад нашых рук струменіць у цэхах сталь, узлятаюць у вышыню самалёты...», і ні слова пра студэнцкае жыццё.

Не трэба апраўдвацца тым, што, маўляў, мы гісторыкі, хімікі, а не журналісты. Прывяду хаця б такую дэталь. Побач з газетай «Хімік», палову якой займае святочнае віншаванне, астатнюю плошчу — перадавы артыкул і тры невялікія калонкі з гісторыі нашай краіны, вісіць факультэцкі «Камсамольскі пражэктар». Упэўнена, ніхто не пройдзе міма, не прачытаўшы яго. І сакрэт зусім просты: матэрыял змешчан на злабадзённую тэму, падабраны цікавыя здымкі.

Хімфак і біяфак — суседзі. А іх газеты, быццам палярныя полюсы. Біёлагі таксама не журналісты, а іх газета не ўступіць журфакаўскай ні ў якасці матэрыялаў, ні ў змястоўнасці, ні ў афармленні. Газета біёлагаў кампактная, акуратна аформленая. Ёсць у рэдкалегіі і фантазія, і дасціпнасць, і густ. Якасць здымкаў выдатная. Выкарыстан кожны сантыметр газетнай плошчы. Адчуваюцца ўдумлівыя адносіны рэдкалегіі да кожнага матэрыялу.

«Віта» адгукаецца на кожную падзею факультэта. За мінулыя месяцы яна расказала аб камсамольскіх справах («Задачы інтэрклуба»), аб падрыхтоўцы да Кастрычніцкага свята («Даёш святочнае афармленне»), аб пераможцах сацыялістычнага спаборніцтва («Працаваць трэба»). Спецыяльны карэспандэнт піша аб сходзе ў інтэрнаце («Хто ж адказвае?»), дзеліцца ўражаннямі ад паездкі ў ГДР чацвёртакурсніца Л. Кніга, не пакіне чытачоў абыякавымі матэрыял аб факультэцкім ансамблі («Нованароджанаму дапамажыце»...).

«Каму ён патрэбен, гэты футбол на нашым факультэце?» — звяртаюць увагу вынесеныя ў пачатак радкі матэрыялу «Мы і футбол». Арыгінальна ўжываюць аўтары матэрыялаў рубрыкі. Але галоўнае ў газеце — зайздросная якасць матэрыялаў.

Усё тое, на што мне хацелася б звярнуць увагу, — крытыка не дзеля крытыкі, а дзеля справы — вышэй падняць выхаваўчую і агітацыйную ролю факультэцкага друку.

**Т. МАНЁНАК,**
**студэнтка III курса журфака.**

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

«Няма нічога даражэй за незалежнасць і свабоду», — гэтыя словы Хо Шы Міна сталі дэвізам вечара, прысвечанага савецка-в'етнамскай дружбе, які адбыўся ў інтэрнаце № 7 БДУ.

Цеплыня і сардэчнасць, з якой савецкія студэнты віталі сваіх в'етнамскіх сяброў, яшчэ раз паказалі святасць і непарушнасць вузаў вялікай дружбы нашых народаў.

На працягу больш чым 30-гадовай барацьбы В'етнам стаў для ўсіх прагрэсіўных людзей планеты сімвалам высокага імкнення да волі, незалежнасці, шчасця. Прайшло нямногім больш 3 год з тае пары, калі прадстаўнікі старога рэжыму Паўднёвага В'етнама на чале з прэзідэнтам З'юнг Ван Мінгам абвясцілі па радыё аб поўнай і безагаворачнай капітуляцыі. Флаг нацыянальнага фронту вызвалення ўзняўся над прэзідэнцкім палацам, узняўся над свабодным В'етнамам.

В'етнамскі народ прыступіў да мірнага будаўніцтва і аднаўлення сваёй гаспадаркі, ідучы па шляху, які ўказала кампартыя В'етнама. З першых дзён сваёй слаўнай гераічнай барацьбы народ В'етнама заўсёды адчуваў руку дапамогі і падтрымку Савецкага Саюза.

В'етнам, які перамог, свята ўшаноўвае памяць савецкіх воінаў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны за свабоду і светлае жыццё на зямлі.

— Малая земля, геройская земля,
Юная звезда надежды и любви.
Малая земля, российская земля,
Бой во имя всей земли.

Гэтай новай песняй Аляксандры Пахмутавай адкрылі сваё прывітанне савецкім студэнтам в'етнамскія сябры. Аспірант фізічнага факультэта То Туан расказаў прысутным аб славутасцях в'етнамскай сталіцы, аб дасягненнях сацыялістычнага В'етнама ў галіне навукі і прамысловасці, аб яго песнях і танцах. «Танцы ў В'етнаме, — адзначыў То Туан, — вызначаюцца сваёй тонкасцю, знешняй прыгажосцю і хараством». Гледачы маглі пераканацца ў гэтым, калі на сцэну ў суправаджэнні пяшчотнай мелодыі выйшлі дзве дзяўчыны. «Танец са свечкамі» выконваўся ў паўцёмнай зале. Гэта яшчэ больш падкрэслівала арыгінальнасць танца, яго самабытнасць, прыгажосць выканання.

Потым выступіў ансамбль мастацкай самадзейнасці 1 курса факультэта журналістыкі. Песня пра В'етнам была данінай тым, хто загінуў у барацьбе за свабоду і незалежнасць В'етнама.

Цесна было ў зале. У гэты вечар у інтэрнаце гучалі песні на розных мовах, але яны былі зразумелы ўсім прысутным, таму што спявала іх моладзь, спявала будучыня планеты на мове дружбы, а мова дружбы зразумелая ўсім.

**Л. ВАНЮШКІНА,**
**студэнтка II курса**
**журфака.**

# *Вучымся аналізаваць*

**У канцы лістапада на факультэце журналістыкі праходзіла навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Прысутнічалі і замежныя студэнты, якія займаюцца на першым курсе факультэта.**

**З увагай былі праслуханы даклады Людмілы Копаць «60 год БССР і Кампартыі Беларусі і рэспубліканская газета «Звязда», Дзмітрыя Беленькага «Сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 60-годдзя БССР і КПБ на старонках рэспубліканскага друку», Таццяны Петрашкевіч «Прапаганда перадавога вопыту ў рэспубліканскім друку».**

**Тэмы дакладаў розныя, але ўсе яны аб'яднаны мэтай — паказаць тыя вялікія змены, што адбыліся ў друку нашай рэспублікі за перыяд яго існавання. Заслугоўвае ўвагі імкненне студэнтаў прааналізаваць праблемы сацыяльнага і эканамічнага развіцця нашай дзяржавы праз даследаванне матэрыялаў радыё і тэлебачання. Газетныя артыкулы, цікавыя тэлеперадачы адлюстроўваюць гісторыю станаўлення, развіцця і росквіту Савецкай Беларусі ў сям'і брацкіх рэспублік.**

**Заслуга пачынаючых даследчыкаў яшчэ і ў тым, што яны здолелі прааналізаваць шляхі і метады адлюстравання сацыялістычнай сучаснасці сродкамі масавай інфармацыі, выказаць у гэтай сувязі свае ўласныя меркаванні.**

**Па строгаму рэгламенту на кожнае выступленне было адведзена 12 мінут. Дакладчыкам пры падрыхтоўцы належала выбраць са сваіх навуковых работ самае галоўнае, характэрнае. Не ў кожнага гэта атрымалася. Лепш за ўсіх выступіла студэнтка III курса Наталля Якімава, прачытаўшая даклад на тэму «Фільм, глядач, рэцэнзент».**

**Вольна, адрываючыся ад «выратавальнага» канспекта, гаварыў студэнт IV курса Аляксандр Гайдук. Ленінскай тэме, адлюстраванай у творчасці беларускіх паэтаў, быў прысвечан яго даклад «Беларуская паэтычная Лeнініяна».**

**Цікавасць аўдыторыі выклікала выступленне студэнткі III курса Людмілы Бусько. У яе дакладзе «Спецыфічнасць публіцыстычнага вобразу» тэарэтычныя разважанні ўдала падмацаваны прыкладамі з перыядычнага друку.**

**Вядома, не кожная думка нашых дакладчыкаў успрымалася як адкрыццё, як нешта новае, што патрабуе абмеркавання. Але былі ў дакладах і самастойныя думкі, смелыя меркаванні. Слухачы шчыра рэагавалі, задавалі сустрэчныя пытанні, дыскусіравалі.**

**П. ВАСЮЧЭНКА,**
**студэнт III курса**
**факультэта журналістыкі.**
Фота **М. Дубовіка.**

**НА ЗДЫМКАХ: праблемы савецкага тэлебачання даследаваў С. Новікаў; у час канферэнцыі.**







# КАБ СПЯВАЛА МАРЗЯНКА

Сюды рэдка прыходзяць балельшчыкі. А калі прыходзяць, то не прыносяць з сабою транспарантаў і не скандуюць: «Шайбу!». Эмоцыі тут не дапамогуць, наадварот — яны перашкаджаюць. Я маю на ўвазе радыёспорт, які патрабуе перш за ўсё сканцэнтраванасці, нервовай вытрымкі.

Панавала цішыня. Спартсмены-радысты схіліліся над лістамі паперы, напружана чакалі. Сакратар спаборніцтваў Улас Ільіч Дулінаў уключыў магнітафон: «Кантрольны тэкст. Пачатковая хуткасць — 60 знакаў у мінуту...». І ў радыёпакоі заспявала марзянка. Пачаўся прыём радыёграм. А чарговым этапам спаборніцтваў была перадача на тэлеграфным ключы.

Неабходна заўважыць, што выступленні радыёспартсменаў сталі традыцыйнымі ва універсітэце. На гэты раз спаборніцтвы былі прысвечаны 60-годдзю ўтварэння БССР і КПБ.

Як заўсёды, лепшыя вынікі паказала каманда факультэта журналістыкі. Дарэчы, ужо чатыры гады запар яна займае першае месца. Заваяваная і на гэты раз перамога паказвае, што журналісты не збіраюцца здаваць сваіх пазіцый і ў далейшым. Другое і трэцяе месцы занялі адпаведна каманды хімічнага і гістарычнага факультэтаў. У асабістым заліку найлепшых вынікаў дабіліся студэнты фізічнага факультэта У. Мельнічук і С. Залаты. Але здзівілі ўсіх радыёфізікі, яны зусім не выставілі каманду. Не з'явілася на спаборніцтва таксама і каманда філалагічнага факультэта. Незразумелай застаецца і пазіцыя камітэтаў ДТСААФ геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў. У саставе іх каманд было ўсяго па аднаму ўдзельніку. Відаць, за аснову імі бралася: абы ўдзел, а там — хоць трава не расці.

Прагледзеўшы пратаколы спаборніцтваў за мінулыя гады, прыходзіш да наступнага заключэння. Каманды адных факультэтаў пастаянна займаюць прызавыя месцы, а каманды другіх — заўсёды ў апошніх. Адказаць, чаму так атрымліваецца, не цяжка. У радыёспорце за кароткі тэрмін дасягнуць высокіх вынікаў нельга. Патрэбны сістэматычныя трэніроўкі. І таму на факультэтах, дзе гэтаму віду спорту аддаецца дастатковая ўвага,— добрыя поспехі. Больш за ўсё здзіўляе іншае: каманды біялагічнага і філалагічнага факультэтаў не робяць ніякіх практычных крокаў да выпраўлення свайго становішча. У нас, ва універсітэце, працуе радыёспартыўны гурток, але ж пра яго, відавочна, на гэтых факультэтах «забыліся».

А што адкажуць камітэты ДТСААФ факультэтаў, над якімі штогод вісіць дамоклаў меч безадказнасці?

**С. ПАЎЛАЎ.**

**Першаразраднік Павел Стасевіч займаецца радыёспортам вось ужо 4 гады.**
**Каманда факультэта журналістыкі, капітанам якой ён з'яўляецца, заняла першае месца на першынстве універсітэта.**
**Фота В. Маскалёва.**

# Складаемыя поспеху

На конкурсах мастацкай самадзейнасці, як правіла, механіка-матэматычны факультэт займае адно з першых месц. У чым жа складаемыя поспеху самадзейных артыстаў?

Вялікую зацікаўленасць і ўвагу да мастацкай самадзейнасці праяўляе камітэт камсамола факультэта. Яго члены, у прыватнасці Ірына Кавалевіч, намеснік сакратара па маральна-эстэтычнаму выхаванню, студэнтка III курса, і адказная за работу агітбрыгады, чацвёртакурсніца Таня Любушкіна дабіваюцца не толькі масавасці мастацтва, яны імкнуцца павышаць якасць выступленняў, выяўляць новыя таленты і адначасова развіваць майстэрства старэйшых удзельнікаў самадзейнасці.

Стала добрай традыцыяй на факультэце праводзіць дні мехмата. На гэтым своеасаблівым свяце студэнтаў немалая роля адводзіцца мастацкім калектывам.

Работа з маладымі талентамі на факультэце звычайна вядзецца з самага пачатку навучальнага года. Так вось і сёлета. З цікавасцю сустракалі матэматыкі новае папаўненне — студэнтаў-першакурснікаў. На калгасных і саўгасных палях, за работай, амаль стыхійна складваліся агітбрыгады і групы мастацкай самадзейнасці ССГА першакурснікаў, якія на калгасных сцэнах праводзілі першыя канцэрты. І ўжо пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ гэтыя групы прынялі ўдзел у тэматычных вечарах, аглядзе факультэцкай мастацкай самадзейнасці.

Нельга абысці і такі факт: актывісты факультэцкай самадзейнасці арганізавалі своеасаблівае сацыялістычнае спаборніцтва. Спаборнічаюць паміж сабой агітбрыгады, мастацкія калектывы і групы двух патокаў, пяці курсаў. Выступленні паточных калектываў на вечарах адпачынку, канцэрты тэатра мініяцюр прыцягваюць да сябе ўвагу шматлікіх гледачоў.

Усяго некалькі год назад, у 1975 годзе, была створана факультэцкая агітбрыгада. Яе канцэрты карыстаюцца папулярнасцю не толькі на факультэце, але і ў БДУ і нават за яго межамі. Вось, напрыклад, 17 лістапада выступілі «Ваганты» ў адным з вучылішчаў Мінска, а 24 лістапада іх слухалі навучэнцы Барысаўскага ГПТВ-121. У агітбрыгадзе склаўся цудоўны, дружны калектыў улюбёных у мастацкую самадзейнасць студэнтаў.

У гэтым годзе калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта папоўніўся новымі талентамі. Хочацца пажадаць ім, як і астатнім аматарам самадзейнасці, вялікіх поспехаў на сцэне, сур'ёзных і добразычлівых гледачоў, цікавых выступленняў.

**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**студэнт I курса журфака.**

# ДАНІНА ПАВАГІ

Для ўдзельнікаў семінараў Сцяпана Хусейнавіча Александровіча і Рыгора Міхайлавіча Семашкевіча (адпаведныя тэмы: «Праблемы сучаснай беларускай літаратурнай крытыкі», «Праблемы сучаснай беларускай паэзіі») спецыялізацыяй стала літаратура. Зроблены першыя даклады, выступленні, напісаны рэцэнзіі. Адзін цыкл работы скончан. Перад пачаткам другога студэнты нашых семінараў вырашылі наведаць месца апошняга спачынку Купалы, Коласа, Чорнага і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Вайсковыя могілкі па вуліцы Казлова... Амаль непарушная цішыня сярод шумнай сталіцы. Сцяпан Хусейнавіч вядзе нетаропкі расказ пра людзей, пахаваных у розныя часы і пры розных абставінах.

Першым спаткаў нас Паўлюк Трус. Юнак, як і Максім Багдановіч, непрыкметнай знічкай згарэў на шпітальным ложку, хіба што з адным адрозненнем — на роднай зямлі. Побач — Алесь Гурло. Яны назаўсёды застануцца маладымі ў гісторыі беларускай літаратуры.

Пліта з выбітымі словамі: «Научыўся я слоў беларускіх ад маці...» Радок шчырага верша-споведзі «Мая навука» Янкі Купалы на магіле самага дарагога для песняра чалавека. Бянігна Іванаўна Луцэвіч толькі на два дні перажыла сына. Даведаўшыся пра смерць Янкі ў далёкай Маскве, матчына сэрца не вытрымала страшнай навіны. 30 чэрвеня 1942 года ў акупіраваным Мінску хавалі 85-гадовую маці беларускага генія.

Апошнімі на сцяжынках успамінаў сустрэлі нас Купала і Колас. Застылі ў манументах волаты сусветнага розуму і таленту. Ля падножжа ў кожнага жывыя кветкі, як жывая памяць беларусаў, нацыі, сусвету.

Маўклівыя і задуменныя вярталіся мы ў мітусню горада пасля незабыўнай сустрэчы.

**Я. ЯНУШКЕВІЧ.**

# КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Прэс-цэнтр прафкома БДУ і рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» працягваюць конкурс на лепшы матэрыял аб прафсаюзным жыцці універсітэта.

Тэматыка і жанры — разнастайныя. Гэта могуць быць матэрыялы аб прафсаюзным жыцці універсітэта, аб прафсаюзнай групе, аб лепшых праформах універсітэта, камсамольскіх актывістах, а таксама аб культурна-масавай і спартыўнай рабоце, аб вольным часе студэнтаў, аб рабоце ў інтэрнатах, аб інтэрнацыянальным выхаванні.

Матэрыялы здаваць у прафком універсітэта (геафак, п. 4) з адзнакай «На конкурс».

Вынікі конкурсу будуць падведзены да 5 мая 1979 года. Пераможцаў чакаюць граматы прафкома і каштоўныя падарункі.

# Незнаёмымі сцежкамі

**«Гэта ўсё людзі, якія вучацца ці працуюць, любяць сваю работу, але ім гэтага мала. Яны ведаюць, што свет не заканчваецца за мяжой кальцавой дарогі, што ёсць яшчэ іншыя рэкі, іншыя лясы, іншыя кліматычныя зоны. І яшчэ ёсць горы, і яшчэ трэба ўсё гэта ўбачыць і прайсці, а інакш і работа не ў радасць, і горад прыкры...»**

**А. КРУП.**

*(З ДЗЁННІКА)*

«Кожны пройдзены метр — выпрабаванне. А для мяне гэта самаправерка і самавыхаванне. І калі мы вернемся дамоў, то яшчэ доўга многім з нас будуць сніцца твае вяршыні, Каўказ».

На падлозе акуратна разасланыя макраватыя спальнікі. На іх сядзяць дзяўчаты. Гучаць турысцкія песні, чуецца прыглушаны гоман і смех.

— Народ! Давайце зробім цяпер разбор паходу. Навошта адкладваць? Заўтра ж апошні дзень, — прапануе Наташа Даўгалёва.

— І сапраўды. Давайце, а? — падтрымлівае прапанову кіраўнік групы Васіль Машчанка.— Наташа! Можа ты і пачнеш?

Спачатку нясмела, пазіраючы на сяброў, гаворыць Даўгалёва. Але з кожным словам голас становіцца ўпэўненым. Яна прыгадвае цікавыя і складаныя дні паходу.

Наташа, як і большасць удзельнікаў, першы раз у горным паходзе. І на Усходнім Каўказе, дзе прадстаяла прайсці паход першай катэгорыі складанасці, таксама ўпершыню. Маршрут аказаўся не з лёгкіх: трэба было пераадолець разведкай мала знаёмы перавал, узысці на вяршыню і скласці аб гэтым апісанне. Перавал Архоціставігеле... Ён стаў першым у жыцці Дзімы Хайкіна, Эдзіка Голада, Ірыны Кісялёвай, Валодзі Апаровіча, Галі Лапкоўскай. А першай сваёй вяршыняй яны назавуць Архоці.

*(З ДЗЁННІКА)*

«Кароткі прывал. Хочацца запісаць галоўнае. Эдзік Голад змахнуў з твару пот. Усе ўскінулі на плечы рукзакі. І пад знаёмае «паехалі» прадоўжыцца ўзыходжанне».

Крок за крокам ісці становіцца цяжэй: сціскае дыханне ад разрэджанасці паветра. Ногі, здаецца, напоўнены свінцом. А вось і тур... Мы на Архоці — вышыні ў 3.197 метраў. Тут мы пакінем сваю запіску ў туры. Шчоўкае фотаапаратам Таня Паўлоўская. Схіліўшыся над картай, звяраюць далейшы маршрут Васіль Машчанка і Лёня Сыркін.

У гэты момант ніхто з нас нават не здагадваўся, што праз два дні, калі мы будзем спускацца ўніз, у гарах пачнуцца ліўні. І туман на доўгі час схавае ад нас сонца. І мы будзем бачыць пад нагамі мокрую слізкую траву. Ніхто не прадбачыў, што на перавале выпадзе снег і прыйдзецца прайсці не толькі асноўны маршрут, а і два запасныя.

*(З ДЗЁННІКА)*

«Учора ў гарах прайшла навальніца. Шырыня рэчкі рэзка павялічылася. Пачынаецца дождж. Нам нізавошта не абысці гэта месца па мокрых скалах».

З галавы не выходзяць насцярожаныя словы альпіністаў групы Косці Салака (таксама студэнтаў нашага універсітэта), якіх мы сустрэлі яшчэ да ўзыходжання на вяршыню: «Сцеражыцеся! Аса непраходная!»

Аса пачынаецца з крыніц і талых вод снежнікаў на паўночных сланцавых стромах галоўнага водараздзельнага хрыбта заходней перавала Багавачосгеле. Кіламетры праз два рэчка крута зварочвае ўлева. Яе імклівы паток уразаецца ў адвесныя скалы. Аса пеніцца, шыпіць, скрыгоча каменнямі. Месца для пераправы падбірае Дзіма Хайкін. Закончаны апошнія прыгатаванні. Як каманда, гучаць словы Валодзі Апаровіча: «Гатова! Пара...»

Першым у ваду ступае кіраўнік групы Васіль Машчанка. Зірнуўшы на нас, бадзёра ўсміхаецца. За кожным яго крокам сочаць таварышы, каб у неабходны момант прыйсці на дапамогу. На зямлі напагатове страховачная вяроўка. Асноўная — навісла над вадой. Прайсці больш двух метраў ад берагу не ўдаецца, бурлівы паток збівае з ног.



На здымку: у час паходу.

Фота Л. Сыркіна.

## Успаміны аб леце

Рукі моцна сціскаюць вяроўку. Марудна распаўзліся напружаныя мінуты. Нехта з палёгкай уздыхнуў. На процілеглым беразе, увесь мокры, стаіць на валуне Васіль. Ён будзе прымаць рукзакі, а потым пачне перапраўляцца ўся група.

*(З ДЗЁННІКА)*

«Ці прыйшла б на дапамогу я? Так, прыйшла б, калі б не апярэдзіў таварыш».

На сярэдзіне рэчкі паток вады абрушыўся на Свету Зубараву. Ёй прышчапіла страховачным карабінам пальцы. Кожны паспеў падумаць: «Небяспечна!» У любы момант дзяўчыну можа знесці патокам вады. Усё адбылося імгненна. Васіль Машчанка прыгае ў кіпень патоку і дапамагае выбрацца Свеце.

У момант развітання з гарамі адчуваеш, што табе чагосьці не хапае. Але мы ведаем, перакананы, што яшчэ не адзін раз вернемся да беласнежных вяршынь і перавалаў. А пакуль прыступіць да работы ў лабараторыі універсітэта малодшы навуковы супрацоўнік Васіль Машчанка, а ў навукова-даследчым інстытуце сельскай аўтаматызацыі—інжынер Валодзя Апаровіч, пачне свой новы працоўны дзень на «Інтэграле» Таня Паўлоўская. Леанід Сыркін, выкладчык фізікі, выдзеліць некалькі хвілін урока, каб расказаць вучням аб прапітаных потам штармоўках, аб надзейным плячы таварыша, які заўсёды побач. Будучых географаў Ірыну Кісялёву і Галю Лапкоўскую, студэнтаў-радыёфізікаў Дзіму Хайкіна і Эдзіка Голада, студэнтку ФПМ Наташу Даўгалёву чакаюць шумныя студэнцкія калідоры. І на пытанне аднакурснікаў: «А там страшна было?» яны адказжуць: «Што вы, цікава!»

**Т. ШУЛЬГА.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

**НАШ АДРАС** 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 1803. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 11035